# ЗА РОДНУЮ ЗЯМЛЮ, ЗА СВАБОДУ!

**(Уступная прамова старшыні Вярхоўнага Совета БССР Н. Я. НАТАЛЕВІЧА)**

Наша слова гарачага прывітання я звяртаю да цябе, вялікі беларускі народ, і да цябе, родная Беларусь, спапялёная, але непакорная.

Да вас, вольныя сыны гордай і свабоднай Беларусі — партызаны і партызанкі, паказваючыя бяспрыкладныя ўзоры мужнасці і адвагі ў барацьбе супроць фашысцкіх забойцаў і гвалтаўнікоў, за нашу свабоду і незалежнасць, за вялікую справу Леніна-Сталіна.

Праз вякі цяжкай і ўпартай барацьбы пранёс і захаваў беларускі народ сваю культуру, сваю мову, права на свабоднае жыццё. З рук Леніна і Сталіна пасля вялікага Кастрычніка беларускі народ атрымаў сваю дзяржаўнасць.

Дваццаць тры гады, не шкадуючы сіл, працалюбівы беларускі народ будаваў совецкую дзяржаўнасць, прарабіў велізарную работу па ўсямернаму развіццю сваёй гаспадаркі і культуры. Добра, светла і радасна жылі працоўныя Беларусі з цвёрдай упэўненасцю ў будучым жыць яшчэ лепш.

І тое, што так блізка і дорага нашаму сэрцу, лютыя ворагі — нямецка-фашысцкія акупанты рашылі ў нас адабраць і знішчыць, яны паставілі сабе мэтай знішчыць нашу совецкую беларускую дзяржаву, нашу шматвяковую беларускую нацыянальную культуру.

Але фашысцкія нягоднікі жорстка пралічыліся. Ніколі беларускі народ не гнуў шыі і не схіляў кален перад захопнікамі і гвалтаўнікамі. Ніколі беларускі народ не стане рабом нямецкіх баронаў.

Зямля Беларусі — совецкая зямля. Яна частка нашай вялікай совецкай бацькаўшчыны. Не аддасць яе на ганьбаванне фашысцкім сабакам наш совецкі народ. Не будуць каласіцца палеткі Беларусі для фашысцкіх баронаў! Не будуць насіць яны вопраткі з беларускага ільну. Не будуць шумець для іх нашы драмучыя беларускія лясы.

З'яднаны вакол вялікага Сталіна, грудзьмі паўстаў на абарону Радзімы-маці народ-багатыр, вялікі совецкі народ. Не пакіне ён у бядзе сваіх кроўных братоў-беларусаў.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

***З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі***